# Выбор

# Народны сход і Народны суд



Некалькі месяцаў таму на шэрагу сайтаў, у незалежнай прэсе з’явілася інфармацыя, што Віктарам Івашкевічам і Генадзем Федынічам вылучана ініцыятыва правесці па ўсёй краіне Народныя сходы, на якіх працоўныя, інтэлігенцыя, пенсіянеры, усе жыхары Беларусі змогуць выказаць думкі, меркаванні наконт сітуацыі, у якой апынулася нацыя, наконт тых першачарговых палітычных, эканамічных, культурніцкіх задач, якія неабходна тэрмінова вырашыць, адным словам, адкрыта пагаварыць пра лёс Айчыны ў гэты цяжкі, няпросты час.

“Народная Воля” вырашыла пацікавіцца, наколькі ініцыятыва атрымала працяг і што могуць сёння сказаць грамадскасці тыя, хто выйшаў да яе з прапановай наконт правядзення **8 кастрычніка Народнага сходу**.

Наш субяседнік — **Віктар Івашкевіч**, сустаршыня аргкамітэта па правядзенні Народнага сходу, журналіст, былы рэдактар газэты “Рабочы”.

**— Што вас падштурхнула да ідэі Народнага сходу?**

— Калі каротка сказаць — гэта **бандытскае абрабаванне ўсяго народу** (раптоўная дэвальвацыя беларускага рубля і шалёны рост цэнаў), не меньш **бандыцкі гвалт над людзьмі, што мелі смеласть сказаць праўду** пра сённяшнюю ўладу (зняволенне у турмах кандыдатаў у прэзідэнты Андрэя Саннікава, Мікалая Статкевіча, Дзмітрыя Уса, дзесяткаў іншых палітзняволенных) і абурэнне **подласцю і нахабствам беларускага дыктатара** які ўпэўнены, што ўсё гэта яму сыйдзе з рук.

Вы самі паглядзіце, што ўлада зрабіла за ўсяго некалькі месяцаў:

23 мая, абрынуўшы беларускі рубель на 56%, Лукашэнка адным махам забраў у людзей больш за палову месячнага заробку.

Пенсіянеры, таксама сталі ахвярамі беларускіх правіцеляў. З-за дэвальвацыі сярэдні памер пенсіяў у даляравым эквіваленце знізіліся са 193 (на пачатак мая) да 115 даляраў. Пенсіянеры адразу сталі бяднейшыя на 40%.

Тым часам інфляцыя ў Беларусі сёлета ўжо склала 36,2%. Але рэальна, найважнейшыя многіе тавары першай неабходнасьці падаражэлі ў два, ў чатыры разы. Прычым нават урад прызнае, што цэны будуць расьці і далей.

На пачатак мая ўклады насельніцтва ў нацыянальнай валюте складалі 10,1 трлн. рублей ці 3,3 млрд. даляраў пры курсе крыху больш 3 тысячаў рублёў. Але ў выніку дэвальвацыі аб’ём рублёвых укладаў скараціўся да 2 млрд. даляраў у эквіваленце. То бок ва ўкладчыкаў скралі адразу 1,3 млрд. даляраў.

Дык, што? Будзем моўчкі глядзець, што робіць улада? Ці возмемся за абарону сваёй маёмасці, сем’яў, правоў і годнасці? Пакуль пратэставаць будуць сотні ці нават тысячы чалавек, з намі ніхто не будзе лічыцца. **Толькі калі на вуліцы дзесяткаў беларускіх гарадоў выйдуць сотні тысячаў грамадзянаў, улады мусяць пачуць нашыя патрабаванні!**

**— А якія патрабаванні вы збіраецеся вылучыць падчас Народнага сходу?**

— Галоўнае патрабаванне — **вярніце людзям тое, што ў іх скралі!**

Вярніце заробкі і пенсіі да тых памераў (у даляравым эквіваленце) якімі яны былі на пачатку года!

Вярніце ўкладчыкам банкаў 1,3 млрд. даляраў, што яны згубілі ў выніку дэвальвацыі!

Спыніце рост цэнаў!

Дайце магчымасць людзям свабодна абменьваць валюту і вяртаць валютныя крэдыты ў беларускіх рублях!

**— А дзе ўлада возьме грошы, каб выканаць вашыя патрабаванні?**

— **Грошы ў дыктатара ёсць, пры тым асабістыя грошы.**

Масква ацэньвае яго маемасьць на **8-12 мільярдаў даляраў** — такую лічбу агучыў тэлеканал НТВ. ЗША — прыблізна гэтакжа. У дакладах амэрыканскіх дыпламатаў, абнародаваных на сайце Вікілікс называецца лічба на 9 мільярдаў.

Дзе ён мог узяць гэтыя грошы? Даходы ад гандлю зброяй, канфісакванымі на мытні таварамі, працэнты ад транзыту ды рээкспарту тавараў у Расею, латэрэі і азартных гульняў, арэнды дзяржаўнай маёмасці, гатэляў, турызма і многага іншага — усё гэта ідзе ў Рэзэрвовы прэзыдэнцкі фонд і на рахункі Ўпраўленьня справамі прэзыдэнта. Лукашэнка адзін распараджаецца грашыма гэтых структур, як уласнай маёмасьцю. Ніхто ніколі не кантраляваў гэтых сумаў.

Беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы працуюць са стратамі не таму, што нафта дарагая, ці няма попыту на іх прадукцыю. У 2007 годзе ўрад стварыў закрытую структуру — Закрытае акцыянэрнае таварыства Беларуская Нафтавая кампанія — якая ўсе прыбыткі ад гандлю нафтапрадуктамі забірае сабе, а нашым заводам адшпільвае капейкі за выкананьне працы. Куды ідуць гэтыя грошы, колькі кампанія плаціць падаткаў, ці плаціць іх наагул — невядома нікому, бо прадпрыемства закрытае, а значыць справаздачы даваць не абавязаная. У сьпісах найбуйнейшых падаткаплацельнікаў Беларусі, яе, прынамсі няма.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*



# Друзья и единомышленники!

Мы обращаемся к вам, чтобы все знали, что **команда Санникова** не распалась, не опустила руки и не будет покорно ожидать, когда у наших друзей, лидеров, настоящих Людей, закончатся срока, которые им прилепили (не присудили! Суда не было, был фарс...

Мы говорим — у власти не получилось то, что она задумала, а именно — замолчать, заболтать, заглушить память о героях-”декабристам”, как стали называть их уже, пожалуй, все.

Мы обращаемся к тем, кто вошел в инициативную группу А.Санникова, кто собирал подписи, кто стоял в пикетах, кто просто агитировал за нашего кандидата. Вы все отлично поработали. Несмотря на трудности, были собраны подписи. Мы обращаемся и к тем, кто поставил свою подпись за Андрея Санникова, к тем, кто проголосовал за него, к тем, чьи голоса украли!

Давайте не забывать о нашем кандидате в президенты. Давайте бороться за то, чтобы политические репрессии в стране прекратились, чтобы политзаключенные были освобождены. Когда режим рухнет, а мы уверены, что скоро; будут проведены честные демократические выборы, и Андрей Санников — лучший из кандидатов, будет избран.

**Обращаемся ко всем, кто ЗА Андрея Санникова. Отзовитесь! Присоединяйтесь!** Вместе мы будем лучшей политической силой, способной победить режим, и вернуть Беларусь из образа “замшелой совковой диктатуры в центре Европы” в тот образ, который наша Родина заслуживает: цивилизованной европейской страны с толерантным, образованным, работящим народом.

Андрей Санников оказался опасен для диктаторского режима и был брошен в тюрьму. Приговаривая А.Санникова к 5 годам заключения, диктатура рассчитывала, что он и его соратники — Дмитрий Бондаренко, Александр Отрощенков, другие политзаключенные, уже не смогут в ближайшее время бороться с режимом, с беззаконием в стране. Они надеялись, что Санников им больше не опасен, что тюрьма заставит его отказаться от борьбы.

Но **Андрей Санников не сломался и не струсил**. Его обращение к народу Беларуси из-за решетки не может оставить равнодушными тех, кто поддержал его на выборах, тех, кто знает и верит, что он лучше, умнее, образованнее узурпатора

Тот, по чьему приказу, А.Санников был брошен за решетку, и те, кто выполнил эти беззаконные приказы, рассчитывали, наверное, что избиратели подзабудут его со временем. Но у них ничего не выйдет!!! Мы будем бороться за освобождение нашего лидера, за честные выборы, за лучшее будущее нашей Беларуси.

Предлагаем всем честным людям Беларуси присоединяться к нам, поддержать Андрея Санникова, помочь кто чем может.

Первой и главной задачей является информирование населения Беларуси о том, что кандидат в президенты Андрей Санников не сломлен, его команда готова действовать, добиваться освобождения политзаключенных и проведения свободных честных выборов.

Каждый, кто готов открыто заявить “Я в команде Санникова!”; кто знает других, также готовых присоединиться к открытым действиям, может связаться с нами, подключив единомышленников, и мы будем действовать сообща.

*(Окончание на 2-й стр.)*

## Друзья и единомышленники!

*(Окончание.*
*Начало на 1-й стр.)*

Надо помнить, что главным условием согласованных действий единой команды является добровольное участие каждого из членов команды. Поэтому мы обращаемся к Вам с просьбой подтвердить свое согласие на участие в команде А.Санникова. Просим связаться с нами по любому из приведенных ниже контактов. С Вами встретится наш координатор, который сможет более подробно рассказать о нашей деятельности или передать Вам информационные материалы для распространения.

**Необходимо привлечь в команду как можно больше неравнодушных людей**, распространить как можно больше обращение Андрея Санникова к народу Беларуси, заявление актива его команды, или другую информацию, которая будет появляться.

Всю информацию о распространении печатных материалов, о нарушении Ваших прав или о репрессиях со стороны властей сообщайте на скайп прессслужбы "Европейской Беларуси" **kate.liudvih.**

Предлагаемые ниже рекомендации не являются обязательным условием участия в команде Андрея Санникова. Любой человек может лично позвонить или написать по указанным контактам. Но если Вы готовы привлечь своих знакомых, друзей, создать любую, пусть самую небольшую группу, то эти рекомендации — для Вас.

На сайтах
http://charter97.org;
http://www.europeanbelarus.org/;
а также
http://www.narodnyshod.org/
можно найти
необходимую информацию,
которую рекомендуется
распространять.
Мы надеемся
на Вашу помощь.

Наши контакты:

для г.Минска:
**e-mail**
eurapejskajabelarus@gmail.com
**skype** jauhen
**тел.**8 029 681 57 37

для регионов:
**e-mail**
europeanbelarus.org@gmail.com
**skype** europeanbelarus_org
**тел.**8 025 951 40 03

Всю информацию
о распространении
печатных материалов,
о нарушении Ваших прав
или о репрессиях
со стороны властей
сообщайте на скайп
пресс-службы
"Европейской Беларуси"
**kate.liudvih**

BELARUS

# Народны сход і Народны суд

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Гэтакжа зь дзяржаўных прадпрыемстваў выпампоўваe грошы і Лукашэнкава атачэньне. Украінская газэта "Дело" ацэньвае маёмасьць кіраўніка дзяржаўнага прадпрыемства Белтэхэкспарт Уладзімера Пефціева на мільярд даляраў. Гандаль зброяй, вядома, звышпрыбытковы бізнэс. Але чаму гэтыя грошы патрапілі ў кішэню дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства? Сёлета Эўразьвяз наклаў на гэтага чалавека санкцыі, як на прыватнага банкіра Лукашэнкі.

**Няхай улады абнародуюць даходы закрытых фондаў і кампаніяў. Няхай Лукашэнкава атачэньне раскрые свае даходы і патлумачыць іх крыніцы. Гэта — мільярды даляраў!**

**— А калі Лукашэнка праігнаруе Народны сход і не прыслухаецца да яговых патрабаванняў, што вы збіраецеся рабіць? Ці пакрычыце, паабураецеся, разыйдзецеся па хатах і ўсё на гэтым?**

— Калі Лукашэнка наплюе на народныя патрабаванні, мы збярэмся ўжо не на Народны сход, а на **Народны Суд** і прыцягнем яго да адказнасці **за махлярства**.

А як яшчэ можна кваліфікаваць дзеянні, калі:

17 снежня, напярэдадні прэзідэнтскіх выбараў, Аляксандар **Лукашенка заяўляў**: "Мы сегодня имеем достаточно золотовалютных резервов, примерно 6-7 млрд. долларов, для того, чтобы удовлетворить любой спрос на валюту. Нам нет необходимости девальвировать национальную валюту ".

17 сакавіка гэтага года глава Нацбанка Пётар Пракаповіч запэўніваў людзей: "Пока я являюсь председателем правления Нацбанка, никакой разовой одномоментной девальвации никогда не будет".

16 красавіка гэтага году **Лукашенка абяцаў**: "Сегодня-завтра-послезавтра мы выровняем ситуацию по валюте — это дело нескольких дней, может быть, неделя".

12 мая **Лукашэнка хлусіў**: " Через один-два месяца мы спокойно забудем всякие валютные неурядицы".

А 23 мая **Лукашенка** адным махам **забраў** у людзей палову заробкаў і палову іхніх банкаўскіх укладаў.

**Палітвязні павінны выйсці з турмаў, а на іх месца павінны сесці сапраўдныя злачынцы, якія подла абрабавалі ўласны народ.**

**— Што вы маеце на ўвазе пад Народным судом і наколькі такі суд будзе законным?**

— **Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: " Адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ.** Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы. Дзяржава адказная перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права ўдзельнічаць у вырашэнні дзяржаўных справаў як непасрэдна, так і праз свабодна абраных прадстаўнікоў."

Калі пракуратура, суды і міліцыя з абаронцаў людзей ператвараюцца ў карнікаў дыктатара, Народ мае права сам ўзяць на сябе абарону сваіх правоў.

Спатрэбіцца, мы пойдзем на ўсеагульны страйк і няспынныя мітынгі на цэнтральных Плошчах беларускіх гарадоў і ўсёроўна дамажамся свайго.

**Але дзеля таго, каб Народны сход і Народны суд былі сапраўды народнымі ў іх павінны прыняць удзел сотні тысячаў грамадзянаў, якія карыстаюцца маральнай падтрымкай мільёнаў беларусаў.** І ніякія карнікі дыктатара нам не здолеюць перашкодзіць. Бо яны тады сто разоў падумаюць, перш чым ісці супраць усяго народу і самім рабіцца злачынцамі.

**— Беларускім заканадаўствам не забаронена правядзеньне мерапрыемства, якое Вы назвалі Народным сходам?**

— Не — не забароненае. Мала таго, што **правядзенне Народнага сходу не забароненае**, але па законе — яно забаронена быць ня можа

**Паводле Канстытуцыі: "Грамадзяне прымаюць ўдзел у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця на рэспубліканскіх і мясцовых сходах."**

**Дзейнічае закон " Аб рэспубліканскіх і мясцовых сходах"**, паводле якога Народныя сходы могуць праводзіцца на ўзроўні раёнаў, гарадоў, раёнаў у гарадох, а таксама мікрараёнаў, жыллёвых комплексаў, кварталаў, вуліцаў, двароў, пасёлкаў, сёл і г.д.

Дзеля падрыхтоўкі мясцовага Народнага сходу грамадзянамі могуць стварацца ініцыятыўныя групы, якія павінны сабраць у падтрымку схода подпісы 10% жыхароў дадзенай мясцовасці. У падпісным лісце павінны быць прастаўленыя прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, адрас і асабісты подпіс грамадзяніна.

Паводле гэтага закону **ініцыятары самі вызначаюць дзень, час і месца Народнага сходу, а ўлады не маюць права яго забараніць ці не дазволіць.**

**— Вядома ж, за любой ініцыятывай стаяць канкрэтныя людзі. І тут многае залежыць ад іх аўтарытэту у грамадстве, у працоўных, навуковых, студэнцкіх і іншых калектывах.Скажыце, калі ласка, хто ўваходзіць у аргкамітэт па правядзенні Народнага сходу, якія заслугі гэтых людзей перад Беларуссю?**

— У нацыяльны аргкамітэт і ва ўсе мясцовыя аргкамітэты (а сёння яны створаны ў 31 горадзе) ўваходзяць **сябры камандаў усіх дэмакратычных кандыдатаў у прэзідэнты**, якія пад час апошняй выбарчай кампаніі шмат зрабілі дзеля данясення да людзей праўды пра сённяшнюю ўладу. " Сустаршыня аргкамітэту **Генадзь Федыніч** больш дзесяці гадоў арганізуе працу незалежнага прафсаюза радыёэлектроннай прамысловасці, які ня гледзячы на ўсе цяжкасці бароніць правы рабочых. **Станіслаў Шушкевіч**, які ўзначальваў Рэспубліку Беларусь у 1991-1994 г.г., і зараз актыўна адстойвае інтарэсы дэмакратычнай Беларусі за мяжой. У аргкамітэце актыўна працуюць **Сяргей Калякін і Віктар Карнеенка**, якія арганізавалі і ўзначальвалі працу па назіранні за выбарамі, што дало магчымасць выявіць канкрэтныя факты фальсіфікацыяў. **Леў Марголін**, прадпрымальнік з Барысава, які шмат год удзельнічае ў арганізацыі барацьбы прадпрымальнікаў за свае правы. **Вінцук Вячорка і Вацлаў Арэшка** вельмі шмат рабілі і робяць дзеля развіцця незалежных няўрадавых арганізацыяў і ініцыятываў. **Зміцер Бародка і Яўген Афнагель** шмат рабілі і робяць па інфармаванні людзей аб рэальнай сытуацыі ў краіне праз газэту "Выбар" і сайт "Хартыя 97". Я сам 5 год выдаваў газэту незалежных прафсаюзаў "Рабочы" і за артыкул аб карупцыі ў адміністрацыі прэзідэнта год адбываў пакаранне на "хіміі".

**— Як вам бачыцца арганізацыя Народнага сходу, скажам, у нейкім аддаленым Райцэнтры, мястэчку, абласным цэнтры, у Мінску?**

— **Ініцыятары павінны стварыць ініцыятыўную групу, сфармуляваць патрабаванні да ўлады, сабраць пад імі подпісы 10% грамадзянаў свайго горада, ці раёна у горадзе, ці мікрараёна, ці жыллёвага комплекса, ці квартала, ці вуліцы, ці двара, ці пасёлка, ці сяла (у залежнасці ад магчымасцяў ініцыятыўнай групы і сабраных подпісаў). Потым прызначыць месца і час сходу, праінфармаваць аб гэтым усіх жыхароў сваёй мясцовасці і 8 кастрычніка правесці Народны сход на якім прыняць патрабаванні да ўлады.**

**— На любы збор людзей павінен быць дазвол мясцовай улады. Дайце тлумачэнне, як павінны звяртацца за такім дазволам арганізатары акцыі і якія дзеянні могуць быць з боку грамадскасці, калі не будзе дазволу на яе правядзенне?**

— Улады не маюць права не дазволіць ці забараніць Народна сход. Паводле законаў арганізатары самі вызначаюць дзень, час і месца сходу. Улады толькі трэба праінфармаваць аб сходзе за 15 дзён. **Лепей прызначаць сход на тыя месцы, якія мясцовымі выканкамамі спецыяльна вызначаныя для масавых мерапрыемстваў.**

Вядома, улады могуць парушыць Канстытуцыю, законы, нават здаровы сэнс і паспрабаваць перашкодзіць правядзенню Народнага сходу, калі на яго прыдуць дзесяткі ці нават сотні людзей. Але **калі нас будзе сотні тысячаў па ўсёй Беларусі, ніхто не пасмее нам перашкодзіць.**

**— Чым у рэшце рэшт павінны скончыцца і Народны сход і Народны суд?**

— **Людзям** павінна быць **вернутае тое, што ў іх скралі.**

Павінны быць **абнародаваныя даходы закрытых фондаў і кампаніяў.**

Павінны быць **пакараныя злачынцы**, якія рабавалі і катавалі беларусаў.

Павінны быць **вызваленыя ўсе палітвязні**.

Павінны адбыцца сапраўды **свабодныя выбары** на якіх беларускі народ свабодна абярэ новую ўладу. Але новаабраныя кіраўнікі ўжо будуць ведаць, што калі яны будуць хлусіць і даваць невыканальныя абяцанкі, то іх напаткае лёс папярэднікаў.

**— Шмат хто з людзей кажа: "А што я магу? Ад мяне нічога не залежыць. Як Бог вырашыць, так і будзе!" Што вы маглі бы сказаць такім людзям?**

— Ёсць такая прытча: Адзін чалавек вельмі верыў у Бога. Аднойчы ў яговай вёсцы пачаўся паводак. Чалавек залез на дах свайго дома і пачаў маліцца. Вось вада паднялася ўжо да даху. Побач праплывае човен і людзі клічуць чалавека: "Паплылі разам з намі!" Чалавек адказвае: "Ня трэба! Мяне Бог выратуе!" Вада ўжо па грудзь, зноў плыве човен і зноў чалавек адмаўляецца ў ім плысці. Вада ўжо па горла, зноў плыве човен і зноў чалавек адмаўляецца: "Мяне Бог выратуе!" Так і патануў чалавек і патрапляе ён да Бога. "Божа! -кажа чалавек, — чаму Ты мяне не выратаваў, я ж так ў Цябе верыў!" "Дурань! — кажа Бог, — я ж табе тры разы човен пасылаў, чаму ты не скарыстаўся!"

**— У чытачоў "Народнай Волі" можа ўзнікнуць нямала іншых пытанняў. Якія каналы сувязі з каардынацыйнымі цэнтрамі Народнага сходу?**

**— З намі можна звязацца:**

**праз наш сайт:**
**www.narodnyshod.org**

**праз mail:**
narodnyshod@gmail.com

**праз Skype: kate.liudvih**

**праз тэлефоны:**
**Брэсцкая вобласць:**
**+375296459744 ,**
**+375297979795 ,**
**Віцебская вобласць:**
**+375291579020 ,**
**+375295981995 ,**
**Гомельская вобласць:**
**+375296992865 ,**
**+375295981995 ,**
**Гродзенская вобласць:**
**+375336229484 ,**
**+375297833738 ,**
**Мінская вобласць:**
**+375259514003 ,**
**+375293342085 ,**
**Магілёўская вобласць:**
**+375293323775 ,**
**+375296517776 .**



Отпечатано на личной множительной технике членов инициативной группы. Тираж 299 экз.